# РАЗВІЦЦЁ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ XVI СТ. (ПА СТАТУТАХ 1529, 1566, 1588 ГАДОЎ)

*С.А.Гур'еў*

Крымінальнае права Беларусі ў XVI ст. найбольшага свайго адлюстравання і развіцця дасягнула ў Статутах ВКЛ, якія сталі буйнымі і найбольш дасканалымі актамі сістэматызацыі і кадыфікацыі феадальнага крымінальнага права не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе. Крыніцамі Статута 1529 г. з'явіліся звычаёвае права, а таксама Судзебнік Казіміра 1468 г., прывілеі, граматы, лісты, судовыя рашэнні, рымскае, польскае і нямецкае права. Статут 1529 г. быў першым у Еўропе зводам законаў, у якім змяшчаліся нормы дзяржаўнага, адміністрацыйнага, шлюбна-сямейнага, грамадзянскага, зямельнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і іншых галін права, ахапіўшы практычна ўсе бакі жыцця тагачаснага грамадства. Пры распрацоўцы Статута былі ўпершыню вырашаны такія складаныя тэарэтычныя і практычныя пытанні, як падзел нормаў права па галінах, размяшчэнне іх у вызначанай сістэме. Хоць у Статуце 1529 г. і прадугледжвалася захаванне прывілеяў і ільгот у галіне крымінальнага права для феадалаў, аднак яго нормы, якія абвяшчалі агульны правапарадак, былі значным крокам наперад. Так, у артыкуле 7 раздзела 1 абвяшчаўся прынцып адказнасці толькі за сваю віну, прынцып прызначэння пакарання толькі асобам, віна якіх устаноўлена судом. Гэтыя прагрэсіўныя прынцыпы змяшчаюцца і ў нормах наступных статутаў. Гэта азначае, што яны сталі базавымі прынцыпамі крымінальнага права XVI ст. [1, с. 58].

Статут 1529 г. стаў асновай для далейшага развіцця заканадаўства і новых Статутаў. У Статут 1566 г. былі унесены істотныя змены ў галіне крымінальнага права. Суб'ектам злачынства прызнаваўся толькі сталы чалавек, адказнасць непаўналетніх наступала з 14-гадовага ўзросту, абвяшчалася прэзумпцыя невінаватасці, далейшае развіццё атрымаў прынцып пакарання толькі па суду. Згодна Статуту 1566 г. асоба, якая

абвінаваціла каго-небудзь у злачынстве і не даказала яго віны, несла такое ж пакаранне, якім мог быць пакараны абвінавачаны ёю.

Статут 1588 г. увабраў у сябе ўвесь досвед папярэдніх статутаў, а таксама адлюстраваў пераход да новага ўзроўню ў развіцці прававой тэорыі, стаўшы сапраўдным помнікам беларускай прававой думкі, навукі і культуры. Статут змяшчаў новыя для крымінальнага права прынцыпы і развіваў папярэднія: роўнасці ўсіх свабодных людзей перад законам, адказнасці толькі ў судовым парадку, індывідуалізацыі пакарання (“нихто иный ни за чый выступ и вчинок не был каран, тольки каждый сам за свой выступ маеть терпети и каран быти” – р. 1, арт. 18) [2, с. 4]. Самым значным прававым прынцыпам, які знайшоў рэгламентацыю ў Статуце, была прэзумпцыя невінаватасці. Падкрэслівалася, што суд “в речах вонтпливых склоннейший маеть быти ку вызволенью нижли ку каранью” [3, с. 250]. Тэрмін турэмнага зняволяння быў невялікі – да 1 года і 6 тыдняў, непаўналетнія падлягалі адказнасці з 16 гадоў (у адрозненне ад  Статута 1566 г.), смяротнае пакаранне не прымянялася да цяжарных жанчын. Вызначаўся таксама тэрмін крымінальнай даўнасці ў 3 гады, па заканчэнні якога асоба не прыцягвалася да адказнасці [4].

Такім чынам, Статуты 1529, 1566, 1588 гг. сталі сапраўднымі помнікамі права Беларусі. Яны аказалі выключны ўплыў на грамадскае, культурнае і палітычнае жыццё не толькі Беларусі, але і навакольных краін, вызначылі асноўныя тэндэнцыі правасвядомасці і правапарадку тагачаснай дзяржавы на стагоддзі наперад, сталі адным з асноўных гістарычных дасягненняў беларускага народа і цэннай культурна-прававой спадчынай для нашчадкаў.

Літаратура:

1. Кузнецов И.Н., Шелкопляс В.А. История государства и права Беларуси: Пособие для студентов ВУЗ. – Минск , 2004. – с.

2. Довнар Т.И., Шелкопляс В.А. Уголовное право феодальной Беларуси (XV-XVI вв.) / Учебное пособие. – Минск, 1995. – С. 4.

3. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Вучэб. дапам. у 2 ч., Ч. 1, Мінск, 2000. – С. 250.

4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / Пер. на бел. мову А.С. Шагун – Мінск, 2005. – с.